# Ліст
# XVI Звычайнай генеральнай асамблеі Сінода біскупаў да народа Божага

Дарагія сёстры, дарагія браты,

Завяршаючы працу першай сесіі XVI Звычайнай генеральнай асамблеі Сінода біскупаў, мы хочам разам з вамі падзякаваць Богу за цудоўны і багаты досвед, які толькі што атрымалі. Гэты благаслаўлёны час мы перажылі ў глыбокай еднасці з вамі. Мы былі падтрыманыя вашымі малітвамі, несучы з сабой вашыя чаканні, вашыя пытанні, а таксама вашыя страхі. Як і прасіў два гады таму Папа Францішак, быў распачаты доўгі працэс слухання і распазнавання, адкрыты на ўвесь Божы народ без выключэння, які дазволіў "падарожнічаць разам" пад кіраўніцтвам Духа Святога, з'яўляючыся вучнямі-місіянерамі, што ідуць за Езусам Хрыстом.

Сесія, на якую мы сабраліся ў Рыме 30 верасня, з'яўляецца важным этапам гэтага працэсу. Шмат у чым гэта быў беспрэцэдэнтны досвед. Упершыню на заклік Папы Францішка мужчыны і жанчыны былі запрошаныя, у сілу свайго хросту, сесці за адзін стол, каб узяць удзел не толькі ў дыскусіях, але і ў галасаванні на гэтай Асамблеі Сінода біскупаў. Разам, ва ўзаемадапаўняльнасці нашых пакліканняў, харызмаў і служэнняў, мы інтэнсіўна слухалі Божае слова і досвед іншых. Карыстаючыся метадам размоў у Духу, мы з пакорай дзяліліся багаццем і нястачамі нашых супольнасцяў з усіх кантынентаў, спрабуючы распазнаць тое, што Святы Дух хоча сказаць Касцёлу сёння. Мы спазналі таксама важнасць падтрымкі ўзаемнага абмену паміж лацінскай традыцыяй і традыцыямі хрысціянскага Усходу. Удзел братэрскіх дэлегатаў іншых Цэркваў і эклезіяльных супольнасцяў глыбока ўзбагаціў нашыя дэбаты.

Нашая асамблея праходзіла ў кантэксце крызіснага становішча ў свеце, раны і абуральная няроўнасць якога балюча адбіліся ў нашых сэрцах, напаўняючы нашую працу асаблівай важнасцю, тым больш, што некаторыя з нас прыбылі з тых краін, дзе бушуе вайна. Мы маліліся за ахвяр забойчага гвалту, не забываючы пра ўсіх тых, каго галеча і карупцыя падштурхнулі на небяспечныя шляхі міграцыі. Мы запэўнілі ў нашай салідарнасці і падтрымцы намаганняў людзей, якія ва ўсіх частках свету працуюць як рамеснікі справядлівасці і міру.

Па запрашэнні Святога Айца значны час быў вылучаны на маўчанне, каб паспрыяць паважліваму слуханню адзін аднаго і жаданню адзінства ў Духу. Падчас уступнага экуменічнага чування мы мелі досвед таго, як жаданне еднасці павялічваецца ў маўклівым сузіранні ўкрыжаванага Хрыста. Фактычна крыж з'яўляецца адзіным тронам Таго, хто, аддаўшы сябе за збаўленне свету, даручыў сваіх вучняў Айцу, каб "усе былі адно" (Ян 17:21). Цвёрда злучаныя ў надзеі, прынесенай

Ягоным уваскрасеннем, мы даручылі Яму наш супольны дом, дзе ўсё больш патрэбным становіцца вокліч зямлі і бедных: “Laudate Deum!” (“Хваліце Бога!”), як нагадаў нам Папа Францішак у пачатку нашай працы.

Дзень пры дні мы адчувалі настойлівы заклік да пастырскага і місійнага навяртання. Бо пакліканне Касцёла — абвяшчаць Евангелле, не засяроджваючыся на саміх сабе, але аддаючы сябе служэнню бясконцай любові, якой Бог палюбіў свет (пар. Ян 3:16). Калі бяздомных людзей каля плошчы св. Пятра спыталіся пра тое, чаго яны чакаюць ад Касцёла з нагоды гэтага сінода, яны адказалі: “Любові!” Гэтая любоў павінна заўсёды заставацца палымяным сэрцам Касцёла — любоў трынітарная і эўхарыстычная, як нагадаў Папа 15 кастрычніка, пасярод нашай асамблеі, спасылаючыся на пасланне св. Тэрэзы ад Дзіцяткі Езуса. Менавіта “давер” дае нам тую адвагу і тую ўнутраную свабоду, якую мы перажылі, калі без ваганняў, свабодна і сціпла выказвалі свае падабенства, адрозненні, жаданні і пытанні.

Што ж цяпер? Мы спадзяемся, што месяцы ў чаканні другой сесіі ў кастрычніку 2024 года дазволяць кожнаму канкрэтным чынам паўдзельнічаць у дынаміцы місійнай еднасці, акрэсленай словам “сінод”. Гаворка ідзе не пра ідэалогію, а пра досвед, укаранёны ў Апостальскай Традыцыі. Як нагадаў нам Папа ў пачатку гэтага працэсу, “еднасць і місія рызыкуюць застацца чымсьці абстрактным, калі мы не будзем развіваць касцёльную практыку, якая выражае *канкрэтнасць сінадальнасці* (...) заахвочваючы рэальны ўдзел з боку ўсіх і кожнага” (9 кастрычніка 2021 года). Выклікі разнастайныя і пытанні шматлікія: падагульняючая справаздача першай сесіі праясніць пункты, па якіх была дасягнута згода, пакажа адкрытыя пытанні і ўкажа, як будзе працягвацца наша праца.

Для таго, каб узрастаць у сваім распазнаванні, Касцёлу абсалютна неабходна слухаць усіх, пачынаючы ад самых бедных. Гэта патрабуе з яго боку шляху навяртання, які адначасова з’яўляецца шляхам хвалы: “Праслаўляю Цябе, Ойча, Пане неба і зямлі, што Ты закрыў гэта ад мудрых і разумных і адкрыў гэта дзецям!” (Лк 10:21). Гэта азначае слухаць тых, каму было адмоўлена ў праве выказвацца ў грамадстве, або тых, хто адчувае сябе выключаным нават у Касцёле; слухаць людзей, якія з'яўляюцца ахвярамі расізму ва ўсіх яго праяўленнях, а ў некаторых рэгіёнах — карэнныя народы, культура якіх сустрэлася з пагардай. Перадусім жа Касцёл у нашыя часы мае абавязак слухаць у духу навяртання тых, хто стаў ахвярай злоўжывання з боку членаў касцёльнай супольнасці, а таксама канкрэтна і структурна прысвяціць сябе гарантаванню таго, што гэтага не адбудзецца зноў.

Касцёл таксама мае патрэбу ў тым, каб слухаць свецкіх вернікаў, жанчын і мужчын, усе з якіх прызваны да святасці на моцы свайго хрысцільнага паклікання; слухаць сведчанне катэхетаў, якія ў многіх сітуацыях першымі абвяшчаюць Евангелле, прастату і жвавасць дзяцей, энтузіязм маладых людзей, іх пытанні і заклікі, мары пажылых людзей, іх мудрасць і іх памяць. Касцёл мае патрэбу ў тым, каб слухаць сем’і, іх выхаваўчыя трывогі, хрысціянскае сведчанне, якое яны прапануюць сённяшняму свету. Яму трэба вітаць голас тых, хто прагне прымаць удзел у свецкім служэнні, у працы структур, якія займаюцца распазнаваннем і прыняццем рашэнняў.

Каб далей узрастаць у сінадальным распазнаванні, Касцёлу асабліва неабходна яшчэ лепш пачуць словы і досвед пасвячоных служыцеляў: святароў, першых супрацоўнікаў біскупаў, сакраментальная паслуга якіх з’яўляецца неабходнай для жыцця ўсяго Цела; дыяканаў, якія праз сваё служэнне выражаюць клопат усяго Касцёла аб служэнні найбольш уразлівым. Яму таксама трэба дазволіць сабе пачуць пытанні з боку прарочага голасу кансэкраванага жыцця — пільнага вартавога паклікання Духа. Яму таксама трэба быць уважлівым да ўсіх тых, хто не раздзяляе ягонай веры, але шукае праўду, і ў кім таксама прысутнічае і дзейнічае Дух, які “дае ўсім магчымасць далучыцца да Пасхальнай таямніцы” (*Gaudium et spes*, 22, 5).

“Свет, у якім мы жывём, — а мы пакліканы любіць яго і служыць яму, нават з яго супярэчнасцямі, — патрабуе, каб Касцёл умацаваў супрацоўніцтва ва ўсіх сферах сваёй місіі. Гэта менавіта той шлях сінадальнасці, якога Бог чакае ад Касцёла ў трэцім тысячагоддзі” (Папа Францішак, 17 кастрычніка 2015 года). Нам не трэба баяцца адказаць на гэты заклік. Марыя, Маці Касцёла, першая ў гэтым падарожжы суправаджае нашую пілігрымку. У радасці і смутку Яна паказвае нам свайго Сына і запрашае нас да даверу. Ён, Езус, з’яўляецца нашай адзінай надзеяй!

*Ватыкан, 25 кастрычніка 2023 года*

世界代表司教会議（シノドス） 第 16 回通常総会 『神の民への手紙』
⇒https://www.cbcj.catholic.jp/2023/10/27/28118/

Л і с т XVI Звычайнай генеральнай а с а м б л е і Сінода біскупаў д а народа ожага
⇒https://www.synod.va/en/news/letter-of-the-xvi-ordinary-general-assembly-of-the-synod-of-bishops-to-the-people-of-god.html